# ПАЛІТЫЧНЫЯ ПОГЛЯДЫ МІКОЛЫ ГУСОЎСКАГА

***Мазуркевіч Ю. С.*** *(УА «МДПУ імя І. П. Шамякіна»)*
***Навуковы кіраўнік** – І. М. Калбасіна, ст. выкладчык*

Мікола Гусоўскі (1470–1533) – выдатны паэт-гуманіст эпохі Адраджэння. Нарадзіўся, верагодна, у вёсцы Уса цэнтральнай Беларусі, у сям'і лоўчага. Першапачатковую адукацыю атрымаў у царкоўна-прыходскай школе. Далейшую адукацыю атрымаў ва ўніверсітэтах Заходняй Еўропы. З 1518 па 1523 гг. знаходзіўся ў Рыме ў складзе Вялікага пасольства ВКЛ да папы Рымскага Льва Х. У 1522 г. тут ім быў напісаны па заказе Льва Х твор "Песня пра зубра" (поўная назва "Песня пра постаць, дзікі нораў зубра і паляванне на яго"), дзе М. Гусоўскі паўстае перад намі як паэт-філосаф, паэт-гісторык, паэт-прыродазнаўца. Аднак нас ён больш цікавіць як паэт-гісторык. Яму ўдалося сфармуляваць і паказаць адну з найбольш важных палітычных ідэй таго часу – неабходнасць аб'яднання еўрапейскіх краін перад пагрозай Асманскай імперыі. Паэт асудзіў братазабойчыя войны еўрапейскіх дзяржаў, іх агрэсіўную знешнюю палітыку ў адносінах адна да другой. Але гэта была не адзіная пагроза для Еўропы. Адзінству хрысціянскага свету пагражае рэфармацыйны рух, які імкнецца ліквідаваць не толькі ўладу папы, але і свецкую ўладу, узбудзіць у грамадстве ўсеагульную нянавісць і варожасць, развязаць грамадзянскую вайну [1, с. 55]. У паэме надаецца шмат увагі праблеме ідэальнага манарха, якую дзеячы еўрапейскага Адраджэння шырока абмяркоўвалі. Прыкладам з'яўляецца князь Вітаўт, які валодаў якасцямі, неабходнымі для



МГПУ им. И.П.Шамякина

манарха. У часы Вітаўта тэрыторыя ВКЛ дасягнула самых вялікіх памераў. Галоўны клопат князя – моцная, баяздольная армія і добрая арганізацыя абароны дзяржавы. У паэме князь паўстае моцным і справядлівым уладаром, які не толькі сам прытрымліваўся хрысціянскіх прынцыпаў, але і клапаціўся пра чысціню хрысціянскай веры, пра яе ўмацаванне і пашырэнне. Княжанне Вітаўта М. Гусоўскі лічыць "залатым векам" ВКЛ. Аднак гэты перыяд заканчваецца пасля смерці Вітаўта. У краіне пачынаюцца сур'ёзныя крызісныя з'явы, якія былі звязаны з беззаконнем, свавольствам вышэйшых слаёў грамадства, вайной з Маскоўскім Княствам і пастаяннай пагрозай з боку крыжакоў [2, с. 71]. Творчасць М. Гусоўскага – прыклад служэння народу. Ён бачыцца нам, сучаснікам, мудрым палітыкам і стратэгам. На жаль, яго погляды і меркаванні не знайшлі падтрымкі, да прарочых заклікаў М. Гусоўскага не прыслухаліся і своечасова не стварылі супольнасць дзяржаў супраць Асманскай імперыі.

**Літаратура**

1. Басюк, І. А. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі: курс лекцый / І.А. Басюк. – Гродна: ГрДУ, 2011. – С. 55–64.

2. Гусоўскі, Мікола. Песня пра зубра / Мікола Гусоўскі; пер. з лацін. мовы і прадм. Я. Семяжона. – Мінск: Маст. літ., 2007. – 71 с.



МГПУ им. И.П. Шамякина